# ПРАБЛЕМЫ ЎЗ'ЯДНАННЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ З БССР: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Матэрыялы
Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі
17–18 верасня 1999 г., Мінск

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

# ПРАБЛЕМЫ ЎЗ'ЯДНАННЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ З БССР: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

**Матэрыялы**
**Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі**
**17 –18 верасня 1999 г., Мінск**

МІНСК
2000

УДК 947.608.4(063)
ББК 63.3(4Беи)621я43
П68

Рэцэнзент
д-р гіст. навук, праф. *У. І. Навіцкі*

Рэдакцыйная калегія:
д-р гіст. навук, праф. *П. І. Брыгадзін* (адк. рэдактар);
д-р гіст. навук, праф. *У. Ф. Ладысеў* (адк. рэдактар);
д-р гіст. навук, праф. *У. М. Міхнюк*

**Праблемы** ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя
П68 і сучаснасць: Матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., 17 – 18 верас. 1999 г., Мінск / Адк. рэд. П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў. – Мн.: БДУ, 2000. – 333 с.

ISBN 985-445-342-1.

У зборніку матэрыялаў Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі разглядаюцца пытанні ўз'яднання беларускага народа, палітычных, сацыяльна-эканамічных і культурных пераўтварэнняў у заходнім рэгіёне рэспублікі.

Выданне будзе карысным для навукоўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і аспірантаў ВНУ, настаўнікаў школ, якія вывучаюць і выкладаюць айчынную гісторыю.

**УДК 947.608.4(063)**
**ББК 63.3(4Беи)621я43**

**ISBN 985-445-342-1**

© БДУ, 2000

дзеля гэтага сродак канфесійнай фікцыі, у адпаведнасці з якім беларускіх католікаў лічылі палякамі, а беларускіх праваслаўных – рускімі, беларусы здолелі захаваць нацыянальную самабытнасць, свой менталітэт, мову, культурныя традыцыі, а таксама сваю дзяржаўнасць.

1. Гарошка Л. Пад знакам «рускае і польскае веры». Мн., 1990.
2. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX стст.). Мн., 1998.
3. Ладысеў У. Ф. Беларуская хрысціянская дэмакратыя – Беларускае народнае аб'яднанне. Палітычныя партыі Беларусі. Сер. 2: Гістарычныя спыткі. Мн., 1994.
4. Мартос А. Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Репринтное изд. Мн., 1990.

***А. М. Вабішчэвіч***
***(Брэсцкі дзяржуніверсітэт)***

# АСВЕТНІЦТВА Ў КАНТЭКСЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА РУХУ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

Пасля ўключэння заходнебеларускіх зямель у 1921 г. у склад Польшчы нешматлікая нацыянальная інтэграцыя звярнулася да выпрабаванага раней шляху асветніцтва. Новая геапалітычная сітуацыя фактычна прадвызначыла мэты, задачы і характар асветніцтва ў Заходняй Беларусі. Яго асаблівасцю стала цесная сувязь з нацыянальна-вызваленчай барацьбой. У асобныя часы асветніцтва было адзінай магчымай формай нацыянальна-культурнага жыцця заходнебеларускага насельніцтва.

Галоўнай культурна-асветніцкай арганізацыяй Заходняй Беларусі стала Таварыства беларускай школы. Паводле статута ТБШ, зацверджанага дэпартаментам унутраных спраў Сярэдняй Літвы 1 ліпеня 1921 г., асноўная мэта арганізацыі – «пашыраць і памагаць асвеце ў беларускім нацыянальным, людскім і хрысціянскім духу». Галоўны напрамак дзейнасці вызначаўся так: «развіццё беларускіх школ і беларускай асветы наогул». Нягледзячы на пэўныя поспехі ў справе адкрыцця беларускіх пачатковых школ, тэрыторыя пашырэння ўплыву Таварыства ў першай палове 20-х гг. была пакуль нязначнай – Віленскі край. Вузкая сацыяльная база стрымлівала колькасны рост ТБШ. Найперш касцяк арганізацыі складалі настаўнікі з Віленшчыны і Навагрудчыны, выпускнікі беларускіх гімназій.

Згаданы перыяд станаўлення ТБШ – першая палова 20-х гг. – вызначаўся выключнай прыхільнасцю асветніцтву. 11–14 красавіка 1923 г. у Вільні адбыўся нават з'езд педагогаў беларускіх гімназій. Сам факт яго правядзення сведчыць аб тым, што ў неспрыяльных умовах нацыянальна-культурнага ўціску з боку польскіх улад Таварыствам ставіліся на парадак дня пытанні павышэння эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчага працэсу. Гэта быў крок дзеля ўзмацнення аўтарытэту арганізацыі па-за межамі Віленшчыны – у іншых заходнебеларускіх землях. Аднак тады ТБШ пазбягала выкарыстання радыкальных палітычных метадаў і сродкаў барацьбы, абмяжоўвалася толькі асветніцтвам. У адной са справаздач аддзела бяспекі Віленскага ваяводства адзначалася, што «ў першыя гады існавання ТБШ не назіралася канкрэтных выпадкаў яго антыдзяржаўнай дзейнасці, акрамя той тактыкі, якой яно прытрымлівалася ў галіне асветы, так і ў Цэнтральнай радзе, на чале якой стаялі ў асноўным дэпутаты Беларускага пасольскага клуба» [1].

Кіраўнік ТБШ Б. Тарашкевіч паступова прыйшоў да высновы, што неабходна было пераадолець малалікасць, інтэлігенцкі характар Таварыста і стварыць народную арганізацыю на аснове барацьбы за беларускую нацыянальную школу, выкарыстоўваючы падачу дэкларацый. Дзеля пашырэння ўплыву варта было школьную кампанію цесна звязаць са змаганнем супраць сацыяльнага прыгнёту.

Недаацэньваць пачатковы перыяд дзейнасці ТБШ нельга. Хоць да сярэдзіны 20-х гг. яно не магло скласці вялікай пагрозы існуючаму польскаму рэжыму, бо мела невялікую колькасць гурткоў у паветах, але паспела зарэкамендаваць сябе ў супрацьдзеянні паланізацыі, вяло агітацыйна-растлумачальную працу, аказвала падтрымку існуючым беларускім гімназіям (асабліва Віленскай) і пачатковым школам. У ходзе разгорнутай кампаніі па зборы подпісаў за адкрыццё школ на роднай мове назапашваўся вопыт для арганізацыі ў далейшым разгалінаванай сеткі акруговых упраў і гурткоў ТБШ [2]. Аднак толькі грамадаўскі ўздым пераўтварыў асветніцтва ў шырокі і масавы рух.

Якасна новы перыяд у асветніцтве Заходняй Беларусі пачаўся з разгортвання дзейнасці Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ). Пытанні нацыянальнай адукацыі, асветы былі ўключаны ў агульнадэмакратычныя палажэнні яе праграмы, прысутнічалі ў практычнай рабоце. Гурткі Грамады праводзілі працу па самаадукацыі людзей, стваралі ў вёсках бібліятэкі-чытальні, збіралі сродкі для будаўніцтва школьных будынкаў. Пад уплывам Грамады Таварыства значна актывізавала сваю асветніцкую працу. Да студзеня 1926 г. па

ўсёй Заходняй Беларусі ўдалося падаць каля 16 тыс. заяў на адкрыццё больш як 400 школ. На месцах вялікую дапамогу аказвалі члены БСРГ. Як адзначалася ў справаздачы палескага ваяводы за верасень 1926 г. пад удзеяннем прапаганды гурткоў Грамады «насельніцтва кожны раз з большай неахвотай адносіцца да польскіх школ» [3]. Статыстыка галоўнай управы ТБШ сведчыць аб тым, што да 1928 г. агульная колькасць дэкларацый перавысіла 30 тыс. – на 1229 школ [4]. Супрацоўніцтва з БСРГ дало магчымасць Таварыству стварыць уласную сетку арганізацыйных адзінак ва ўсім краі.

Узмацненне ўплыву Грамады на ТБШ з'яўлялася непасрэдным вынікам дыферэнцыяцыі заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Гэта не хацелі прызнаваць лідэры Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД), якая стаяла на іншай ідэйна-палітычнай платформе, чым БСРГ. БХД выступала супраць аддзялення школы ад царквы, патрабавала выхавання дзяцей у школах у клерыкальным духу. У яе другой праграме, прынятай у лістападзе 1927 г., было пацверджана права навучацца ў школах на роднай мове, а таксама абавязковае выкладанне там рэлігіі. А. Станкевіч лічыў, што неабходна абуджаць нацыянальную свядомасць людзей на аснове хрысціянскай этыкі і дэмакратычных прынцыпаў. Пашырэнне ўнутры ТБШ рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў прызнаваў шкодным для захавання яго аўтарытэту. «БХД заўсёды добра разумела, што яе вартасць аказваецца праўдзівай тады, калі яна ідзе ў пару з працай культурна-асветнай для народу» [5]. Таму пасля дасягнення паразумення з Беларускім сялянскім саюзам была створана ў 1926 г. альтэрнатыўная ТБШ культурна-асветніцкая арганізацыя – Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК), якая павінна была пашырыць сацыяльную базу БХД. Дадзеная арганізацыя ўнесла пэўны ўклад у супрацьдзеянне паланізацыі. Аднак ідэйна-палітычныя супярэчнасці, узаемныя папрокі ТБШ і БІГіК выключылі магчымасць іх супольных дзеянняў у школьнай справе. Наладзіць адзіны асветніцкі рух так і не ўдалося.

Разгром Грамады рэжымам «санацыі» ў студзені – лютым 1927 года, па-першае, рэзка зменшыў колькасць гурткоў – лагічны вынік рэпрэсіўных дзеянняў, па-другое, паспрыяў іх масаваму росту, бо БСРГ і КПЗБ загадзя паклапаціліся аб пераўтварэнні ТБШ у «другую лінію акопаў». Уцалелыя ад ганенняў грамадоўцы пераходзілі ў яго гурткі. Найбольш значнае пашырэнне сеткі гурткоў адбылося якраз там, дзе існавалі шматлікія і актыўныя арганізацыі Грамады – у Навагрудскім, Косаўскім, Гродзенскім, Слонімскім, Стаўбцоўскім

паветах. «Рух, якім кіравала ліквідаваная БСР Грамада, цяпер поўнасцю перайшоў у ТБШ, дзейнасць якога на тэрыторыі Навагрудскага, Віленскага і часткова Палескага ваяводстваў набыла вялікія памеры» [6]. Амаль уся тэрыторыя Заходняй Беларусі пакрылася сеткай гурткоў, бібліятэк-чытальняў, народных дамоў. Хоць у гістарычнай літаратуры прыводзяцца розныя лічбы членаў Таварыства (ад 10,3 да 30 тыс. чалавек), але найбольш абгрунтаванымі і пераканаўчымі выглядаюць сцвярджэнні, што ў сярэдзіне 1927 г. больш за 400 гурткоў аб'ядноўвалі 12–13 тыс. чалавек, а да сярэдзіны наступнага года, калі пачалася чарговая хваля рэпрэсій, налічвалася 14–15 тыс. чалавек у 430 гуртках [7]. Гэтая статыстыка ўвабрала ў сябе дадзеныя як Галоўнай, так і акруговых упраў.

Разам з былымі грамадоўцамі камуністы Заходняй Беларусі таксама шырока выкарыстоўвалі легальны характар ТБШ. Яны атрымалі перавагу ў многіх яго акруговых управах. Грамадоўскія метады працы надалі КПЗБ станоўчы аўтарытэт у Таварыстве. Курс на далейшае пашырэнне такой работы быў пацверджаны на І з'ездзе КПЗБ (чэрвень – ліпень 1928 г.). У прынятай рэзалюцыі «Сітуацыя і задачы партыі», якая мела праграмны характар, былі вызначаны канкрэтныя задачы ў змаганні супраць нацыянальнага прыгнёту. У іх аснову была пакладзена барацьба за агульнадэмакратычныя патрабаванні.

Польскія ўлады неаднаразова дамагаліся выдалення з гурткоў, кіраўніцтва Таварыства «падрыўных элементаў». Адмова пайсці па такім шляху і стала фармальный падставай для забароны 28 жніўня 1928 г. дзейнасці Галоўнай управы. Гэта выклікала палярызацыю поглядаў у кіраўніцтве ТБШ. Як і камуністы, прадстаўнікі беларускага пасольскага клуба «Змаганне» І. Дварчанін, Я. Гаўрылік і іншыя выступалі за актыўную палітычную працу Таварыства. Яны лічылі неадрыўнай барацьбу супраць нацыянальнага ўціску і сацыяльнага прыгнёту. Таму імкненне да палітызацыі работы ТБШ было натуральным вынікам узмацнення рэвалюцыйна-дэмакратычных настрояў у заходнебеларускім грамадстве. Такі характар нацыянальна-вызваленчага руху быў прадвызначаны невырашальнасцю сацыяльных пытанняў. Аднак у такіх абставінах кіраўнікам ТБШ важна было ўстрымлівацца ад штучнай і празмернай палітызацыі, каб не страціць магчымасць легальнай барацьбы.

Група дзеячаў нацыянальна-дэмакратычнай інтэлігенцыі (Р. Астроўскі, А. Луцкевіч, Я. Шнаркевіч і іншыя) настойліва сканцэнтроўваецца выключна на асветніцкай працы. Безумоўна, што

такі паварот на шлях лаяльнай дзейнасці быў вельмі выгадны польскім уладам, якія мелі намер «уціхамірыць» арганізацыю. Такі раскол у кіраўніцтве ўскладніў становішча ў Таварыстве. З восені 1928 г. супрацьстаянне перакінулася ў акруговыя і павятовыя ўправы, што падрывала моц ТБШ.

Супрацоўніцтву з нацыянальна-дэмакратычнай інтэлігенцыяй перашкаджалі пераацэнка, спрашчэнне аб'ектыўных тэндэнцый развіцця грамадства заходнебеларускім камуністычным рухам. Лідэры КПЗБ імкнуліся выставіць максімалісцкія лозунгі і патрабаванні [8]. Барацьба за ўплыў у ТБШ паміж рознымі палітычнымі сіламі перашкаджала выніковасці, эфектыўнасці асветніцкай працы. Не заўсёды прыходзіла разуменне наконт аб'яднання намаганняў у змаганні за нацыянальна-культурныя каштоўнасці. Невыпадковым ва ўмовах дыферэнцыяцыі заходнебеларускага руху было стварэнне БІГіК, які таксама шмат рабіў у галіне асветніцтва, хаця і быў арганізацыйна слабейшы за ТБШ.

Справу асветніцтва ў Заходняй Беларусі спрабавалі ўзяць у свае рукі паланафільскія партыі і арганізацыі. «Беларуская санацыя» прызнавала заганнай і шкоднай тактыку канфрантацыі, а таму лічыла неабходным шукаць кампрамісы з польскімі ўладамі. Створанае ў 1932 г. на аснове Цэнтрасаюза Таварыства беларускай асветы абмежавалася ў сваёй дзейнасці выключна голым культурніцтвам. «Наша мэта – адшукваць у вёсцы прыдатныя для культурна-асветніцкай работы сілы і арганізаваць невялікія групы, гурткі здольных да актыўнай працы на чыста культурніцкім фронце» [9]. У цэлым паланафільскія аб'яднанні не адыгралі значнай ролі на ніве асветніцтва. Нярэдка яны функцыяніравалі пры падтрымцы польскіх улад. Паланафільскія ідэі не знайшлі шырокага адабрэння і падтрымкі з боку насельніцтва Заходняй Беларусі.

Значнымі асветніцкімі пляцоўкамі з'яўляліся беларускія гімназіі ў Вільні, Навагрудку, Клецку, Радашковічах і іншых гарадах. Яны фарміравалі кадры нацыянальнай інтэлігенцыі, якая разумела неабходнасць захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей народа, далучэння да вызваленчай барацьбы. Гімназіі не стаялі па-за палітычным жыццём заходнебеларускага краю.

Пасля таго, як Галоўная ўправа ў канцы жніўня 1929 г. зноў атрымала магчымасць легальнага існавання, умовы для дзейнасці істотна не змяніліся. Па-ранейшаму польскія ўлады наносілі ўдары па ТБШ. Толькі са жніўня 1930 да канца 1931 г. было закрыта каля 100 гурткоў. Адначасова кіраўніцтва Таварыства падвяргалася

беспадстаўным абвінавачваннем з боку КПЗБ. Такая пазіцыя партыі была вынікам памылковай тактычнай лініі, замацаванай на III пленуме яе ЦК у кастрычніку 1929 г. – непасрэдна на сацыялістычную рэвалюцыю, якая адмаўляла супрацоўніцтва з арганізацыямі сацыял-дэмакратычных партый, дэмакратычным крылом беларускай інтэлігенцыі. Таму невыпадковым было з'яўленне ў 1933–1934 гг. не толькі памылковых, але і шкодных для асветніцкай справы рэзалюцый ЦК КПЗБ «Аб хістаннях сярод часткі дзеячаў руху Заходняй Беларусі», «Аб асноўных крыніцах нацыянал-апартунізму ў КПЗБ», «Агонь барацьбы супраць нацыянал-апартунізму». Сярод «перамог» называлася «дэмаскаванне сапраўднага твару цяперашняй Галоўнай управы ТБШ, на чале якой стаіць Шырма, Марцінчык, Станкевіч і іншыя агенты нацыянал-фашызму і польскай дэфензівы...» [10].

Нават у такіх складаных умовах уцалелыя адзінкі ТБШ праводзілі асветніцкую працу. «Мы павінны імкнуцца, хаця ў межах сваіх маленькіх магчымасцей, да наталення таго духоўнага голаду, які пануе на вёсцы, – адзначаў Р. Шырма, – павінны шукаць шляхі, што лучылі б паміж сабой шчырых і свядомых, але распыленых па ўсёй Заходняй Беларусі, ідэйна адданых культурнай працы адзінак» [11].

Аднак з-за жорсткіх ганенняў рэжыму «санацыі» праца ТБШ затухала.

Імпульс для ажыўлення дзейнасці Таварыства, яго супрацоўніцтва з БІГіК далі рашэнні VII кангрэса Камінтэрна, II з'езда КПЗБ (9–18 мая 1935 г.) аб неабходнасці стварэння шырокага антыфашысцкага народнага фронта. Сумесная школьная акцыя ТБШ і БІГіК у 1936 г. актывізавала асветніцкі рух. Інтэнсіўна ішло складанне дэкларацый у Баранавіцкім, Браслаўскім, Ваўкавыскім, Вілейскім, Маладзечанскім, Слонімскім і іншых паветах. Таварыства беларускай асветы з-за палітычных меркаванняў адмовілася ад сумесных дзеянняў: быццам гэтая кампанія накіроўвалася з Масквы. Польская адміністрацыя аказала моцнае супрацьдзеянне школьнай акцыі. Фактычна ўвесь паліцэйскі апарат быў выкарыстаны для барацьбы з рухам за адкрыццё беларускіх школ. Як і ў першай палове 30-х гг., не ўдалося разгарнуць агульнакраёвы культурна-асветніцкі рух. 2 снежня 1936 г. была забаронена дзейнасць ТБШ, 4 снежня – БІГіК. Гэтыя рашэнні былі пацверджаны яшчэ раз 22 і 27 студзеня наступнага года.

Пасля знікнення арганізаваных форм асветніцтва засталіся спадзяванні на менш прыкметную працу па самаадукацыі, хатнім навучанні. Групы самаадукацыі да 8 чалавек маглі існаваць у кожнай вёсцы без дазволу мясцовых улад. Роля настаўніка адводзілася

любому адукаванаму чалавеку, інтэлігенту. Такая форма асветніцтва заставалася адзінай магчымай. Настаўнік С. Паўловіч, адзін з кіраўнікоў ТБШ, склаў і выдаў буквар для хатняга навучання «Першыя зярняткі» (1936) (у 1937 г. – «Засеўкі» з лацінскай азбукай). С. Грыневіч у кнізе «Асвета (Аб народным універсітэце і іншых спосабах асветнай працы)» (1936) таксама папулярызаваў шэраг мер па самаадукацыі, навучанні па-за школай. Шмат зрабіў у прапагандзе самаадукацыі часопіс «Беларускі летапіс». Аднак занапад нацыянальна-вызваленчага руху не даваў добрых перспектыў для асветніцтва.

---

1. Дзяржаўны архіў Літвы. Ф. 51. Воп. 17. Спр. 521. Арк. 35.
2. Больш падрабязна гл.: Вабішэвіч А. Таварыства беларускай школы: першыя гады існавання // Спадчына. 1996. № 5. С. 31–51.
3. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей – ДАБВ). Ф. 2. Воп. 1. Спр. 1135. Арк. 93.
4. НА РБ. Ф. 883. Воп. 1. Спр. 112. Арк. 2.
5. Станкевіч А. Беларускі хрысціянскі рух. Вільня, 1993. С. 206–207.
6. ДАБВ. Ф. 1. Воп. 9. Спр. 462. Арк. 77.
7. Полуян В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.). Мн., 1978. С. 107–108.
8. Ладысеў У.Ф. Цяжкі шлях выпрабаванняў // Беларускі гіст. часопіс. 1994. № 1. С. 85–86.
9. НА РБ. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 463. Арк. 42.
10. Аб асноўных крыніцах нацыянал-апартунізму ў КПЗБ (Рэзалюцыя ЦК КПЗБ). Вільня, 1934. С. 4.
11. Летапіс ТБШ. 1933. № 1. С. 1–2.

***В.Г. Мазец***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі)***

## БЕЛАРУСКІ СТУДЭНЦКІ САЮЗ ЯК ФАКТАР НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ МОЛАДЗІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Беларускае студэнцтва як найбольш свядомая частка свайго народу заўсёды знаходзілася ў авангардзе барацьбы за нацыянальна-культурнае адраджэнне. Не было выключэннем і заходнебеларускае студэнцтва Віленскага універсітэта. У снежні 1920 г. у Віленскім універсітэце быў заснаваны «Гурток студэнтаў-беларусаў», у 1921 г.